**УДК 903/904(476.6)**

# З ГІСТОРЫІ ВЫВУЧЭННЯ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ БАСЕЙНА РАКІ ШЧАРЫ

***А.М. МАКСІМОВІЧ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*Даследуецца гісторыя археалагічных помнікаў эпохі Сярэднявечча на тэрыторыі басейна ракі Шчары. Вылучаны чатыры этапы ў вывучэнні рэгёна: канец XIX – пач. XX ст.; 1920–40-е гг.; 1950–70-е гг.; 1980-е – пач. XXI ст. У рамках кожнага з этапаў разгледжана дзейнасць асноўных даследнікаў (Ф.У. Пакроўскі, Ф.Д. Гурэвіч, Я.Г. Звяруга, У.Г. Супрун, А.У. Квяткоўская і інш.). Дана адзнака стану даследаванняў (наяўнасць складзенай крыніцазнаўчай базы, шэрагу гіпотэз аб этнічным складзе насельніцтва, эканамічным і культурным развіцці рэгёна); складзена карта вядомых помнікаў (каля 160, з іх 9 даследавана раскопкамі); вызначаны актуальныя праблемы: праверка і ўдакладненне наяўных гіпотэз, даследаванне сістэмы рассялення, а таксама шляхі іх магчымага рашэння – археалагічнае даследаванне з прыцягненнем метадаў сумежных навук.*

Басейн ракі Шчары – адзін з рэгёнаў Панямоння. У прыродна-геаграфічным плане яму ўласціва пэўная арганічнасць, якую забяспечвае наяўнасць натуральных межаў: на поўначы – рака Нёман, на захадзе – рака Зальвянка, на ўсходзе – Моўчадзь, на поўдні – рака Ясельда (мал. 1). Гэта акалічнасць часам абумоўлівала адміністратыўны падзел дадзенай тэрыторыі, напрыклад, межы Слонімскага павета Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) праходзілі па лініі азначаных рэк [1, с. 340–341].




Мал. 1. Басейн ракі Шчары – тэрыторыя даследаванняў

У гісторыка-культурным аспекце тэрыторыя басейна ракі Шчары таксама ўяўляе вельмі цікавы рэгён, які з'яўляўся часткай гэтак званай Чорнай Русі. Да XIII стагоддзя гэта зямля ўваходзіла ў склад Полацкага княства, а пазней – ВКЛ. Доўгі час за валоданне ёю спрачаліся літоўскія і галіцка-валынскія князі, і яе памежны характар, магчыма, знайшоў адлюстраванне ў назве галоўнага мясцовага горада Слоніма, найменне якога, па аднаму з меркаванняў, паходзіць ад слова "ўслон" – заслон, пэўнае засланяючае збудаванне. Значнасць гэтай тэрыторыі абумоўлена ракой Шчарай, якая злучае Палессе з Панямоннем і Прыбалтыкай [2, с. 28; 3, с. 6–7].

Вывучэнне помнікаў басейна ракі Шчары пачалося яшчэ ў XIX стагоддзі і звязана з дзейнасцю беларуска-польскага фалькларыста, этнографа і археолага М. Федароўскага, які праводзіў 1880-х гадах раскопкі ў наваколлях Слоніма. У 1881 годзе ім быў раскапаны курган пад Вішавам (мал. 2: *2*). У кургане было знойдзена каля дваццаці фрагментаў ганчарнай керамікі XI–XII стагоддзяў. Вынікі працы

М. Федароўскага былі апублікаваны ў 1882 годзе З. Глогерам [4; 5, с. 7; 6, с. 84]. Матэрыялы захоўваюцца ў зборах Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве (Польша) [7, с. 126].




Мал. 2. Помнікі басейна ракі Шчары:
**гарадзішчы:** 5 – Збочна, 9 – Слонім, 12 – Маскалі, 16 – Навасёлкі, 22 – Дзярэчын, 26 – Шулякі, 43 – Пархуты, 56 – Асабнякі, 59 – Мяльканавічы, 67 – Шылавічы, 73 – Высацк, 74 – Дзераўная, 77 – Жыровіцы, 87 – Талькаўшчына, 94 – Ніз, 102 – Ягнешчыцы, 111 – Гарадзішча, 112 – Станкевічы, 113 – Вялікае Сяло, 118 – Добры Бор, 123 – Старая Мыш, 136 – Косава, 142 – Свяціца, 143 – Воньկі, 144 – Гарадзішча, 145 – Ляхавічы;
**селішчы:** 10 – Каралі, 17 – Навасёлкі, 18 – Сінявічы, 23 – Дзешкавічы, 24 – Казловічы, 36 – Дварэц, 38 – Норцэвічы, 40 – Гарадкі, 42 – Пархуты, 44 – Салавічы, 46 – Чарлёнка, 48 – Дзямянаўцы, 50 – Накрышкі, 52 – Латышы, 54 – Вялікая Воля, 57 – Асабнякі, 60 – Пасінічы, 63 – Парэчча, 65 – Чапялева, 68 – Шылавічы, 69 – Рахавічы, 71 – Высацк, 75 – Кавалі, 78 – Русакова, 80 – Баравікі, 82 – Масілавічы, 84 – Мілошавічы, 85 – Міцькавічы, 86 – Талькаўшчына, 88 – Шундры, 91 – Юхнавічы, 93 – Ніз, 96 – Голі, 99 – Камлявічы, 100 – Ягнешчыцы, 104 – Глоўсевічы, 105 – Забулле, 106 – Залессе, 107 – Сурынка, 108 – Сянькоўшчына, 109 – Ісаевічы, 110 – Гарадзішча, 116 – Падгорная, 117 – Добры Бор, 119 – Колбавічы, 126 – Доўгае, 127 – Пагор’е;
**могільнікі:** 1 – Васілевічы, 2 – Вішава, 3 – Галынка, 4 – Збочна, 6 – Клепачы (воз. Бяздоннае), 7 – Орлавічы, 8 – Паўлавічы, 11 – Маскалі, 13 – Чарлёнка, 14 – Шчара, 15 – Дубраўка, 19 – Клімавічы, 20 – Пустаборы, 21 – Старое Сяло, 25 – Сынкавічы, 27 – Валоўнікі, 28 – Гернікі, 29 – Гнаінскія, 30 – Нагорнікі, 31 – Явар, 32 – Войневічы, 33 – Маркавічы, 34 – Пруд, 35 – Талявічы, 37 – Галаўлі, 39 – Казлоўшчына, 41 – Нянадавічы, 45 – Салавічы, 47 – Дукрава, 49 – Дзямянаўцы, 51 – Накрышкі, 53 – Студзераўшчына, 55 – Вялікая Воля, 58 – Какошчыцы, 61 – Сакалова, 62 – Ганькі, 64 – Хадзявічы, 66 – Чапялева, 70 – Рахавічы, 72 – Высацк, 76 – Піронім, 79 – Міжэвічы, 81 – Баравікі, 83 – Старадзевяткавічы, 89 – Шундры, 90 – Саковічы, 92 – Юхнавічы, 95 – Паўлавічы, 97 – Едначы, 98 – Камлявічы, 101 – Ягнешчыцы, 103 – Бярдовічы, 114 – Моўчадзь, 115 – Стрэлава, 120 – Серабрышча, 121 – Сталовічы, 122 – Уцес, 124 – Белалессе, 125 – Люшнева, 128 – Жытлін, 129 – Сярадава, 130 – Хадакі, 131 – Галік, 132 – Руда, 133 – Альшаніца, 134 – Бялавічы, 135 – Косава, 137 – Сенькавічы, 138 – Святая Воля, 139 – Гошчава, 140 – Завінне, 141 – Марынова, 146 – Гулічы, 147 – Яцкаўшчына, 148 – Куршынавічы, 149 – Мыслабаж, 150 – Перахрэсце, 151 – Падлессе, 152 – Навасёлкі

*Заўвага*: 1–9 – даследаваныя археалагічнымі раскопкамі.

Значныя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі Панямоння былі праведзены ў сувязі з падрыхтоўкай да IX археалагічнага з’езда, які адбыўся ў 1893 годзе ў Вільні. З’езду папярэднічала вялікая падрыхтоўчая праца. Была выпрацавана праграма вывучэння старажытнасцей Беларусі і Літвы, якая прадугледжвала праверку наяўных звестак аб археалагічных помніках рэгіёна (курганах, гарадзішчах), пошук і раскопкі новых помнікаў, стварэнне археалагічных карт і збор даных аб прыватных калекцыях, абагуль-

ненне атрыманых матэрыялаў. Для збора патрэбнай інфармацыі была створана спецыяльная анкета, якая павінна была рэгламентаваць апісанне археалагічных аб'ектаў падчас правядзення раскопак і разведак. Гэтая анкета была разаслана ў колькасці некалькіх тысяч экзэмпляраў прадстаўнікам мясцовых адміністрацый і статыстычных камітэтаў, а таксама настаўнікам, святарам і ляснічым [8, с. 6; 9, с. 11].

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні IX археалагічнага з'езда прымаў настаўнік Віленскай гімназіі і захавальнік Віленскага музея старажытнасцей Ф.В. Пакроўскі, які праводзіў даследаванні на беларуска-літоўскім памежжы [10, с. 163]. Падчас падрыхтоўкі да з'езда ён склаў падрабязную археалагічную карту Гродзенскай губерні [11], дзе абагульніў усю наяўную інфармацыю аб курганных і грунтовых могільніках, гарадзішчах, паселішчах, скарбах, асобных знаходках манет і культавых камянях, у тым ліку і старажытнасцях басейна ракі Шчары.

Археалагічную карту Гродзенскай губерні складаў да з'езда і Е.Р. Раманаў, але яна так і не была апублікавана [5, с. 9]. Пра курганы і гарадзішчы Слонімшчыны пісалі выкладчык Свіслацкай настаўніцкай семінарыі І.К. Шуліцкі [12, с. 60–65] і святар Я. Міхайлоўскі [13, с. 165–187]. Апошнім быў часткова раскапаны адзін з чатырох каменных курганоў каля гарадзішча Збочна (мал. 2: *4*). Ён жа часткова раскапаў курган каля вёскі Паўлавічы (мал. 2: *8*) [13, с. 166–167, 173], дзе ў 1962 годзе В. Сядоў даследаваў яшчэ адзін курган [14, с. 49–50]. Паведамляў Я. Міхайлоўскі пра курганны могільнік каля маёнтка Орлавічы (зараз паўночны край вёскі Новаорлавічы Слонімскага раёна) (мал. 2: *7*), курганы якога раскопвалі гаспадары маёнтка. Атрыманыя падчас гэтых раскопак матэрыялы былі перададзены ў Варшаўскі музей [13, с. 179].

Разам з Ф.В. Пакроўскім, І.К. Шуліцкім і Я. Міхайлоўскім археалагічныя помнікі тэрыторыі Панямоння на з'ездзе прадстаўляў В.А. Шукевіч. Свае даследаванні ён пачаў яшчэ ў 1880-я гады. Навукоўца цікавілі ў першую чаргу пахавальныя помнікі правабярэжжа верхняга і сярэдняга цячэння Нёмана. Вывучэннем могільнікаў, непасрэдна басейна ракі Шчары, В.А. Шукевіч не займаўся, але на падставе яго прац упершыню стала магчымым уявіць сабе эвалюцыю пахавальнага абраду на тэрыторыі Панямоння ад эпохі латэна да часу ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Да таго ж В.А. Шукевіч першым узняў праблему даследавання летапіснай Чорнай Русі як гістарычнай з'явы, акцэнтуючы ўвагу на геаграфічным фактары яе засялення [8, с. 7–8; 5, с. 9; 15, с. 431].

Адначасова з В.А. Шукевічам іншы раз тыя ж самыя помнікі даследаваў Э.А. Вольтэр. Археалагічных раскопак ён амаль не праводзіў, але зрабіў апісанне прыватных калекцый З. Глогера, В.А. Шукевіча і М. Федароўскага [8, с. 7–8; 5, с. 9]. Больш вядомы як этнограф і антраполаг, Э.А. Вольтэр прысвяціў шэраг публікацый прусам і яцвягам Гродзенскай губерні [16, с. 1–9; 17, с. 151–160].

Віленскі археалагічны з'езд меў вялікае значэнне ў справе археалагічнага вывучэння не толькі тэрыторыі Панямоння, у тым ліку басейна ракі Шчары, але і тэрыторыі Беларусі ўвогуле. Распрацаваная інструкцыя па абследаванню і раскопкам помнікаў археалогіі рэгламентавала палявую працу даследчыкаў, што садзейнічала не толькі павелічэнню колькасці знаходак, але спрыяла сістэматызацыі і павелічэнню інфарматыўнасці атрыманых матэрыялаў. Навукоўцы праводзілі мэтанакіраваныя даследаванні, вынікі якіх у далейшым былі апублікаваны ў працах Віленскага аддзялення Маскоўскага падрыхтоўчага камітэта [18] і IX археалагічнага з'езда [19; 20].

Неабходна адзначыць, што ў вышэйзгаданых публікацыях разглядаліся пераважна помнікі пахавальнага тыпу, а іншыя іх катэгорыі, за невялікім выключэннем, засталіся па-за ўвагай даследчыкаў.

Такім чынам, на пачатак XX стагоддзя быў назапашаны пэўны фактычны матэрыял. Яго абагульніў у сваіх працах А.А. Спіцын, які займаўся вывучэннем, сістэматызацыяй і публікацыяй старажытнасцей Усходняй Еўропы [21, с. 311]. Спіцын зрабіў агляд помнікаў археалогіі Гродзенскай губерні [22, с. 294–297], у якім інфармацыя размяшчалася ў храналагічным парадку, з каменнага веку да Сярэдневечча. Таксама даследчык сістэматызаваў матэрыялы каменных магіл, якія лічыў пахавальнымі помнікамі Чорнай Русі [23, с. 303–310] і абагульніў усе назапашаныя даныя па археалагічных помніках Прыбалтыкі [24]. З матэрыялаў, якія датычацца басейна ракі Шчары, А.А. Спіцын у сваіх публікацыях узгадвае толькі даследаванні М. Федароўскага пад Слонімам, вынікі якіх былі апублікаваны З. Глогерам.

У 1920–1930-х гадах вывучэннем Панямоння займаліся польскія навукоўцы, супрацоўнікі мясцовых музеяў. Як і ў папярэдні час, даследаванне археалагічных помнікаў басейна Шчары было эпізадычным і не мела мэтанакіравана характару. Працягвалася вывучэнне пераважна пахавальных помнікаў. Так, пад Галынкай (сучасная в. Старая Галынка, Зельвенскі раён) Я. Фітцке былі раскапаны тры курганы (мал. 2: *3*) [7, с. 126]; Р. Якімовіч даследаваў тры курганы пад Орлавічамі (сучасная в. Новаорлавічы, Слонімскі раён) (мал. 2: *7*) [25, s. 214, 223; 7, с. 136–137; 26, s. 152–156]. Усе атрыманыя імі матэ-рыялы захоўваюцца ў зборах польскага Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве і на сённяшні дзень цалкам апублікаваныя [7; 26].

У гэты ж час польскія навукоўцы ўпершыню паставілі перад сабой мэту пошуку першапачатковых цэнтраў старажытных гарадоў. У месцы ўпадзення ракі Ісы ў Шчару спробу знайсці старажытны цэнтр горад Слоніма прадпрыняў заснавальнік гарадскога музея І.І. Стаброўскі [27, с. 112].

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны археалагічныя даследаванні ў рэгіёне спыняюцца. Здабыты за папярэднія гады матэрыял застаўся амаль неапублікаваным, а археалагічныя калекцыі былі разрозненыя і часткова загінулі разам з дакументацыяй раскопак.

Працы аднаўляюцца толькі ў 1950-х гадах. З 1955 года пачынае працу Славяна-Літоўскі атрад Прыбалтыйскай археолага-этнаграфічнай экспедыцыі пад кіраўніцтвам Ф.Д. Гурэвіч. Даследаваннямі былі ахоплены два берагі Нёмана, археалагічная карта папоўнілася новымі помнікамі [8, с. 11]. Атрыманыя матэрыялы дазволілі даследчыцы скласці меркаванне аб гаспадарцы, культуры і этнічным складзе насельніцтва Панямоння. Гэтай тэме Ф.Д. Гурэвіч прысвяціла сваю манаграфію «Древности Белорусского Понеманья» [8] і шэраг іншых публікацый [28], у якіх разам з іншымі помнікамі разглядае старажытнасці эпохі Сярэднявечча з тэрыторыі басейна ракі Шчары. Асаблівую ўвагу даследчыца надавала вывучэнню гарадоў Чорнай Русі, у тым ліку Слоніму. У сваіх працах Ф.Д. Гурэвіч разглядала пытанні, звязаныя з фарміраваннем гарадоў [29; 30; 31], іх эканамічным развіццём і знешнім гандлем [32; 33], жылымі і гаспадарчымі гарадскімі пабудовамі [34]. У 1955 годзе Ф.Д. Гурэвіч даследавала каменны курган каля вёскі Васілевічы (мал. 2: *1*) і каменную магілу каля вёскі Клепачы, на беразе возера Бяздоннае (мал. 2 :*6*) [8, с. 193; 14, с. 51–54].

Вывучэннем старажытнага Слоніма займаўся таксама Г.І. Пех. У 1946 годзе ў раёне горада ім былі знойдзены фрагменты рэчаў XII стагоддзя (шкляны бранзалет, кавалкі керамічнага посуду). У 1953 годзе ў месцы, дзе былі зроблены знаходкі, даследчык заклаў шурф, у якім выявіўся культурны пласт XII–XVII стагоддзяў [27, с. 112]. У 1959 годзе на тым самым месцы Г.І. Пех правёў раскопкі [35, с. 276–279].

Значны ўклад у археалагічнае вывучэнне тэрыторыі басейна ракі Шчары ўнёс В.Р. Супрун, які праводзіў свае даследаванні ў 1963–1970 гадах. За гэты час ён выявіў і апісаў каля 200 археалагічных помнікаў, сярод якіх селішчы, гарадзішчы, курганныя і бескурганныя могільнікі. Яго справаздачы аб палявых даследаваннях сталі асновай для складання археалагічных карт Гродзенскай і Брэсцкай абласцей [36, с. 332].

У 1966 годзе пачаў працу Верхненёманскі атрад Інстытута гісторыі АН БССР пад кіраўніцтвам Я.Г. Звяругі. Галоўнай мэтай было вывучэнне сярэднявечных гарадоў, селішчаў і курганных могільнікаў Панямоння [5, с. 12]. Вынікі шматгадовай працы Я.Г. Звяруга падсумаваў у манаграфіі «Верхнее Понеманье в IX–XIII вв.» [5], у якой паспрабаваў разгледзець старажытнасці балтаў і славян, прааналізаваць іх пахавальныя помнікі, гаспадарку, культуру і вераванні. Шэраг сваіх публікацый Я.Г. Звяруга прысвяціў Слоніму, які даследаваў у 1968 годзе [37; 38; 2]. У выніку археалагічных раскопак на тэрыторыі горада быў сабраны багаты археалагічны матэрыял, які з улікам працы, праведзенай раней Г.І. Пехам, дазволіў вывучыць рэшткі гарадской забудовы XII–XIII стагоддзяў і вырашыць пытанні планіроўкі дзядзінца старажытнага Слоніма.

З мэтай даследавання пластоў XIV–XVIII стагоддзяў у горадзе Слоніме былі праведзены раскопкі ў 1983 (кіраўнікі экспедыцыі Н. Здановіч, А. Краўцэвіч) і 1988 гадах (кіраўнікі І.У. Ганецкая, Н. Здановіч). Даследаванні паказалі, што познесярэднявечныя культурныя напластаванні існуюць у розных частках горада, акрамя таго, была пацверджана наяўнасць пасада XII–XIII стагоддзяў уздоўж левага берага ракі Шчары [27, с. 112; 39, с. 21–22].

З 1981 года даследаванне каменных могільнікаў, у тым ліку і на тэрыторыі басейна Шчары, пачынае А.В. Квяткоўская [14]. Даследчыца вывучала каменныя могільнікі, якія суадносіла з яцвяжскім і прускім насельніцтвам [40; 41]. Вынікі сваёй працы яна абагульніла ў манаграфіі «Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII в.) [42], у якой разгледзела пахавальны абрад, інвентар і храналогію могільнікаў, акрэсліла арэал іх распаўсюджвання. У 1982 годзе каля вёскі Клепачы, на беразе возера Бяздоннае, А.В. Квяткоўскай былі даследаваны адзін каменны курган і 66 каменных магіл (мал. 2: *6*) [14, с. 52, 54–56].

У 1990-х гадах даследаванні на тэрыторыі басейна ракі Шчары праводзіў С.А. Піваварчык. У 1995, 1997–1998 гадах з мэтай вывучэння абарончых канструкцый, удакладнення датыроўкі і функцыянальнага прызначэння ён даследаваў гарадзішча Збочна (мал. 2: *5*), на якое неаднаразова звярталі ўвагу Ф.Д. Гурэвіч, В.Р. Супрун, В.В. Сядоў, але грунтоўных раскопак не праводзілі [43; 44, с. 67–68].

Вынікам даследаванняў 1950–1980-х гадоў з’яўляецца таксама выхад шэрагу абагульняючых прац. Сярод іх археалагічныя карты і зборы помнікаў Ю.У. Кухарэнка [45], Г.В. Штыхава [46], Л.Д. Побаля [47], падрыхтаваны пры ўдзеле супрацоўнікаў аддзела археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» [48; 49], аглядныя працы па археалогіі [50; 51; 52 і інш.]. Аднак непасрэдна тэрыторыя басейна Шчары разглядаецца ў іх павярхоўна, як правіла, пры апісанні старажытнасцей Панямоння.

У апошнія дзесяцігоддзі басейн ракі Шчары амаль не вывучаецца археалагічна, але маюць месца тэарэтычныя даследаванні навукоўцаў, краязнаўцаў і супрацоўнікаў мясцовых музеяў. На базе Слонімскага раённага краязнаўчага музея праводзяцца навуковыя канферэнцыі. Па матэрыялах канферэнцыі 2002 года, прысвечанай 750-годдзю Слоніма, быў выдадзены зборнік навуковых артыкулаў [53].

Такім чынам, у гісторыі вывучэння тэрыторыі басейна ракі Шчары можна вылучыць некалькі этапаў:

1) канец XIX – пачатак XX стагоддзя. Пачатак этапа лагічна звязаць з часам падрыхтоўкі і правядзення IX археалагічнага з’езду ў Вільні. Ён характарызуецца высокім навукова-метадычным узроўнем

(распрацоўка адзінай сістэмы археалагічных даследаванняў) і павелічэннем аб’ёму палявых работ. У гэты час былі складзены археалагічныя карты, якія ахопліваюць амаль усё Панямонне. Даследаваліся пераважна пахавальныя помнікі. Даследаваннем менавіта тэрыторыі басейна ракі Шчары было нязначным;

2) 1920–40-я гады. У сувязі з тым, што Заходняя Беларусь да 1939 года знаходзілася ў складзе Польшчы, асаблівасцю другога этапа з’яўляецца вывучэнне разглядаемага рэгіёна толькі польскімі навукоўцамі. Як і ў папярэдні час, вывучаліся пераважна пахвальныя помнікі, разам з тым былі зроблены першыя спробы ў даследаванні гарадоў, у прыватнасці пошукі іх старажытных цэнтраў. Палявыя даследаванні на тэрыторыі басейна ракі Шчары, за невялікім выключэннем, не праводзіліся;

3) 1950–70-я гады. Трэці вылучаны этап адзначаны інтэнсіфікацыяй археалагічных даследаванняў у рэгіёне, якая звязана з даследчыцкай дзейнасцю Ф.Д. Гурэвіч, Г.І. Пеха, Я.Г. Звяругі, В.Р. Супруна. У гэты час разам з вывучэннем пахавальных помнікаў і гарадзішчаў пачалося шматбаковае даследаванне гарадоў і вясковых паселішчаў. Праводзілася абследаванне берагоў Шчары і яе прытокаў, але грунтоўныя раскопкі на мясцовых помніках, як і раней, заставаліся эпізадычнай з’явай;

4) 1980-я гады – пач. XX стагоддзя. Асаблівасцю чацвёртага этапа стала пашырэнне навуковых інтарэсаў: нараўне з вывучэннем раннесярэднявечных гарадоў, гарадзішчаў, селішчаў і курганоў пачынаецца мэтанакіраванае даследаванне матэрыялаў XIV–XVIII стагоддзяў. Сярод даследчыкаў гэтага часу трэба адзначыць А.В. Квяткоўскую, Н.І. Здановіч, І.У. Ганецкую, С.А. Піваварчыка.

На сённяшні дзень на тэрыторыі басейна ракі Шчары вядома каля 160 помнікаў археалогіі (гл. мал. 2), культурны слой якіх утрымлівае матэрыялы эпохі Сярэднявечча. Сярод іх прыкладна палову складаюць курганныя і бескурганныя могільнікі, другую палову – умацаваныя і неўмацаваныя паселішчы з суадносінамі апошніх 1:2 адпаведна. Раскопкамі была даследавана толькі невялікая частка з іх (табліца; мал. 2: *1*–*9*).

Помнікі басейна ракі Шчары, даследаваныя раскопкамі

| № | Адміністрацыйная прыналежнасць | Тып помніка | Даследчык, час даследавання | Датыроўка помнікаў | Даследаваная плошча/раскапана пахаванняў |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | в. Васілевічы, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны могільнік | Ф.Д. Гурэвіч, 1955 г. | XVI (?) ст. | 1 курган |
| 2 | в. Вішава, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны могільнік | М. Федароўскі, 1881 г. | XI – XII ст. | 1 курган |
| 3 | в. Галынка, Зельвенскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны магільнік | Я. Фітцке, 1930-я гг. | ? | 3 курганы |
| 4 | в. Збочна, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны могільнік | Я. Міхайлоўскі, 1892 г. | XI – XII (?) ст. | 1 курган |
| 5 | в. Збочна, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Гарадзішча | С.А. Піваварчык, 1995 г.<br>С.А. Піваварчык, 1997 г. | XII – XIII ст. | прарэзка вала 36 м$^2$ |
| 6 | в. Клепачы, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны і бескурганны могільнік | Ф.Д. Гурэвіч, 1955 г.<br>А.В. Квяткоўская, 1982 г.<br>А.В. Квяткоўская, 1982 г. | XVI ст.<br>XIV – XVII ст.<br>XII – XIII ст. | 1 каменная магіла<br>66 каменных магіл<br>1 курган |
| 7 | в. Орлавічы, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны могільнік | Р. Якімовіч, 1927 г. | XI ст. | 3 курганы |
| 8 | в. Паўлавічы, Слонімскі раён, Гродзенская вобл. | Курганны могільнік | Я. Міхайлоўскі, к. XIX ст.<br>В. Сядоў, 1962 г. | ? | 1 курган<br>1 курган |
| 9 | г. Слонім | Горад | І.І. Стаброўскі, 1920–1930-я гг.<br>Г.І. Пех, 1953 г.<br>Г.І. Пех, 1959 г.<br>Я.Г. Звяруга, 1968 г.<br>Н. Здановіч, А. Краўцэвіч, 1983 г.<br>І.У. Ганецкая, Н. Здановіч, 1988 г. | ?<br>XII – XVII ст.<br>XI – XIII ст.<br>XII – XIII ст.<br>XII – XVII ст.<br>XII – XVII ст. | ?<br>8,4 м$^2$<br>64 м$^2$<br>168 м$^2$<br>?<br>? |

**Заключэнне.** Археалагічнае даследаванне басейна ракі Шчары вядзецца ўжо больш за сто год. За гэты час намаганнямі навукоўцаў і краязнаўцаў была выяўлена вялікая колькасць помнікаў, склалася пэўная крыніцазнаўчая база. Аналіз наяўнага матэрыялу дазволіў даследчыкам скласці шэраг меркаванняў аб эканамічным і культурным развіцці рэгіёна, этнічным складзе яго насельніцтва ў Сярэднявеччы. Але нягледзячы на праведзеную работу, вывучэнне археалагічных помнікаў басейна ракі Шчары застаецца актуальным. Прапанаваныя гіпотэзы патрабуюць праверкі і ўдакладнення, адказу чакаюць пытанні, якія датычацца забудовы і планіроўкі паселішчаў, а таксама агульнага характару сістэмы рассялення.

Для вырашэння акрэсленых праблем звычайнай апрацоўкі і сістэматызацыі наяўнага матэрыялу недастаткова. Патрабуецца распрацоўка і правядзенне дэтальнага археалагічнага даследавання рэгіёна, гэта значыць папярэднія даследаванні па ўсёй яго тэрыторыі з мэтай вызначэння межаў, удакладнення датыровак і культурна-храналагічнай ідэнтыфікацыі помнікаў, з далейшым правядзеннем стацыянарных раскопак на найбольш тыповых з іх, разам з прыцягненнем метадаў сумежных навук, такіх як гістарычная геаграфія і ландшафтазнаўства, глебазнаўства і палеаэкалогія.

ЛІТАРАТУРА

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2001. – Т. 6. Кніга 1: Пузыны – Усая. – 591 с.
2. Звяруга, Я.Г. З гісторыі старажытнага Слоніма / Я.Г. Звяруга // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў / рэдкал.: І.П. Крэнь [і інш.]. – Слонім, 2002. – С. 28–38.
3. Чыгрын, С. Слонімскія падмуркі: гісторыка-краязнаўчыя і літаратуразнаўчыя артыкулы / С. Чыгрын. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 296 с.
4. Gloger, Z. Notatki archeologiczne Michała Fedorowskiego z okolic Slonima / Z. Gloger // Pameitnik fizyjograficzny. – Warszawa, 1882. – T. II. – S. 491–492.
5. Зверуго, Я.Г. Верхнее Понеманье в IX–XIII вв. / Я.Г. Зверуго; под ред. П.Ф. Лысенко. – Минск: Наука и техника, 1989. – 208 с.
6. Звяруга, Я.Г. Насельніцтва Панямоння / Я.Г. Звяруга // Археалогія Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: П.Ф. Лысенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.). – С. 84–108.
7. Поболь, Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши / Л.Д. Поболь: под ред. Ю.В. Кухаренко. – Минск: Наука и техника, 1979. – 208 с.
8. Гуревич, Ф.Д. Древности Белорусского Понеманья / Ф.Д. Гуревич; под ред. П.Н. Третьякова. – М.; Л.: АН СССР, 1962. – 222 с.
9. Вяргей, В. Археалагічнае вывучэнне Беларусі ў другой палове XIX ст. / В. Вяргей // Гістарычна-археалагічны зб. / ІГ НАН Беларусі. – Мінск, 2006. – № 22. – С. 9–13.
10. Плавінскі, М.А. Пакроўскі Фёдар Васілевіч / М.А. Плавінскі // Археалогія Беларусі: у 2-х т. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 163.
11. Покровский, Ф.В. Археологическая карта Гродненской губернии / Ф.В. Покровский. – Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1895. – 165 с.
12. Шулицкий, И.К. Археологические и историко-географические заметки / И.К. Шулицкий // Труды Виленского отделения Моск. предварительного комитета по устройству в Вильне IX археологического съезда. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1893. – Отдел I. – С. 60–65.
13. Михайловский, Е. Археологические очерки Слонимского уезда, Гродненской губернии / Е. Михайловский // Труды Виленского отделения Моск. предварительного комитета по устройству в Вильне IX археологического съезда. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1893. – Отдел II. – С. 165–187.
14. Квяткоўская, А.В. Пахавальныя помнікі пруса-яцвяжскага насельніцтва на Слонімшчыне / А.В. Квяткоўская // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў / рэдкал.: І.П. Крэнь [і інш.]. – Слонім, 2002. – С. 49–61.
15. Каханоўскі, Г.А. Шукевіч Вандалін Аляксандравіч / Г.А. Каханоўскі // Археалогія Беларусі: у 2-х т. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 431.
16. Вольтер, Э.А. К вопросу о ятвягах / Э.А. Вольтер // Ежегодник русского антропологического общества при Императорском Санкт-Петербургском Университете; под ред. Б.Ф. Адлера. – СПб.: Тип. Э. Арнгольда, 1908. – Т. 3. – С. 1–9.
17. Вольтер, Э.А. Следы древних Прусов и их языка в Гродненской губернии / Э.А. Вольтер // Изв. Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук / под ред. А.А. Шахматова. – СПб.: [б. и.], 1911. – Т. XVI. Кн. 4. – С. 151–160.
18. Труды Виленского отделения Моск. предварительного комитета по устройству в Вильне IX археологического съезда. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1893.

19. Труды IX Археологического съезда в Вильне / под ред. П.С. Уваровой [и др.]. – М.: [б. и.], 1895. – Т. 1. – 349 с.
20. Труды IX Археологического съезда в Вильне / под ред. П.С. Уваровой [и др.]. – М.: [б. и.], 1897. – Т. 2. – 328 с.
21. Плавінскі, М.А. Спіцын Аляксандр Андрэевіч / М.А. Плавінскі // Археалогія Беларусі: у 2-х т. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 311.
22. Спицын, А.А. Гродненская губерния / А.А. Спицын // Записки Императорского Русского археологического общества. – СПб.: Тип. И.Н. Скороходова, 1899. – Т. XI. Вып. 1–2: Труды отделения славянской и русской археологии. Кн. 4. – С. 294–297.
23. Спицын, А.А. Предполагаемые древности Черной Руси / А.А. Спицын // Записки Императорского Русского археологического общества. – СПб.: Тип. И.Н. Скороходова, 1899. – Т. XI. Вып. 1–2: Труды Отделения славянской и русской археологии. Кн. 4. – С. 303–310.
24. Спицын, А.А. Литовские древности / А.А. Спицын // Tauta ir žodis. Kaunas: Valtybės Spaustuvė, 1925. – Kn. III: Epe Lituana. Lib. III. – C. 112–171.
25. Jakimowicz, R. Sprawozdanie z działalności Państwowego Muzeum Archeologicznego za rok 1927 / R. Jakimowicz // Wiadomości Archeologiczne. – W., 1935. – T. XIII.
26. Zabytki z okresu wpływow rzymskich, średniowiecza i czasów nowożytnych z Białorusi w zbiorach Państwowego Muzeum Archeologicznego w Warszawie / pod red. A. Piotrowskiego. – W.: DEKA, 2005. – 264 s.
27. Ганецкая, I. Раскопкі старажытнага Слоніма / I. Ганецкая, Н. Здановіч // Гістарычна-археалагічны зб. / IГ НАН Беларусі. – Мінск, 1996. – № 10. – С. 112–128.
28. Гуревич, Ф.Д. Верхнее Понеманье в I тысячелетии и начале II тысячелетия нашей эры (по материалам Прибалтийской экспедиции 1955–1957 гг.) / Ф.Д. Гуревич // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях института археологии / АН СССР; редкол.: Т.С. Пассек (отв. ред.) [и др.]. – М., 1960. – Вып. 81. – С. 13–24.
29. Гуревич, Ф.Д. Древние города Понеманья и Южнорусские земли в конце X – XIII в. / Ф.Д. Гуревич // Средневековая Русь / АН СССР; редкол.: Д.С. Лихачев [и др.]. – М.: Наука, 1976. – С. 25–29.
30. Гуревич, Ф.Д. Древние города Белорусского Понеманья / Ф.Д. Гуревич. – Минск: Полымя, 1982. – 48 с.
31. Гуревич, Ф.Д. О формировании городов Черной Руси по данным археологии / Ф.Д. Гуревич // Советская археология / АН СССР; редкол.: Б.А. Рыбаков (глав. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1983. – № 3. – С. 61–71.
32. Гуревич, Ф.Д. Внешние связи древнерусских городов Понеманья / Ф.Д. Гуревич // Краткие сообщения института археологии / АН СССР; редкол.: О.С. Гадзяцкая (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1982. – Вып. 171: Славяно-Русская археология. – С. 43–49.
33. Гуревич, Ф.Д. Связи древних городов Белоруссии с Причерноморьем и Средиземноморьем / Ф.Д. Гуревич // Древнерусское государство и славяне: материалы симпоз., посв. 1500-летию Киева / АН БССР; редкол.: Л.Д. Поболь [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1983. – С. 63–66.
34. Гуревич, Ф.Д. Жилые и хозяйственные постройки городов Черной Руси / Ф.Д. Гуревич // Краткие сообщения института археологии / АН СССР; редкол.: И.Т. Кругликова (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1989. – Вып. 195: Славяно-Русская археология. – С. 57–62.
35. Пех, Г.И. Раскопки древнего Слонима / Г.И. Пех // Древности Белоруссии: материалы конф. по археологии Белоруссии и смежных территорий; под ред. В.Ф. Исаенко [и др.]. – Минск, 1966. – С. 276–279.
36. Вяргей, В.С. Супрун Васіль Рыгоравіч / В.С. Вяргей // Археалогія Беларусі: у 2-х т. – Мінск, 2011. – Т. 2. – С. 332.
37. Зверуго, Я.Г. Раскопки в Слониме / Я.Г. Зверуго // Археологические открытия 1968 года / АН СССР. – М.: Наука, 1969. – С. 350.
38. Зверуго, Я.Г. Археологические работы в Слониме / Я.Г. Зверуго // Беларускія старажытнасці: матэрыялы канф. па археалогіі БССР і сумежных тэрыторый; рэдкал.: Л.Д. Побаль [і інш.]. – Мінск, 1972. – С. 248–289.
39. Здановіч, Н.І. Раскопкі старажытнага Слоніма / Н.І. Здановіч // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў; рэдкал.: І.П. Крэнь [і інш.]. – Слонім, 2002. – С. 19–23.
40. Квятковская, А.В. Курганы ятвягов конца I – начала II тысячелетия н. э. (устройство и типология) / А.В. Квятковская // Гістарычна-археалагічны зборнік / IГ НАН Беларусі. – Мінск, 1996. – № 10. – С. 58–61.
41. Квятковская, А.В. К вопросу о пруссах – переселенцах на территории Беларуси в средневековье / А.В. Квятковская // Гістарычна-археалагічны зб.; IГ НАН Беларусі. – Мінск, 1997. – № 11. – С. 9–14.
42. Квятковская, А.В. Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI – XVII в.) / А.В. Квятковская. – Vilnius: Diemedzio, 1998. – 327 с.

43. Пивоварчик, С.А. Домостроительство X–XIII вв. белорусского Понеманья (по материалам городищ) / С.А. Пивоварчик // Гістарычна-археалагічны зб. / ІГ НАН Беларусі. – Мінск, 1996. – № 10. – С. 72–74.
44. Дабрыян, А.А. Гарадзішча Збочна – унікальны археалагічны помнік / А.А. Дабрыян, С.А. Піваварчык // Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў; рэдкал.: І.П. Крэнь [і інш.]. – Слонім, 2002. – С. 67–72.
45. Кухаренко, Ю.В. Средневековые памятники Полесья / Ю.В. Кухаренко // Свод археологических источников / АН СССР; под ред. Б.А. Рыбакова. – М., 1961. – 40 с. – (Е1-57).
46. Штыхов, Г.В. Археологическая карта Белоруссии / Г.В. Штыхов. – Минск: Полымя, 1971. – Вып. 2: Памятники железного века и эпохи феодализма. – 275 с.
47. Поболь, Л.Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век / Л.Д. Поболь; под ред. М.А. Ткачева. – Минск: Наука и техника, 1983. – 456 с.
48. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1984. – 424 с.
49. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1986. – 371 с.
50. Очерки по археологии Белоруссии / АН БССР; под ред. Г.В. Штыхова [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1972. – Ч. II. – 248 с.
51. Белорусская археология: достижения археологов за годы Советской власти / В.Ф. Исаенко [и др.]; редкол.: Г.В. Штыхов (глав. ред.) [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1987. – 127 с.
52. Археалогія Беларусі: у 4 т. / рэдкал.: П.Ф. Лысенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 3: Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.) / Я.Г. Звяруга [і інш.], 2000. – 554 с.
53. Слонімшчына вачыма навукоўцаў і краязнаўцаў: матэрыялы рэгіянальнай гісторыка-краязнаўчай канф., прысв. 750-годдзю горада Слоніма і 70-годдзю заснавання Слонімскага раённага краязнаўчага музея ім. І.І. Стаброўскага / склад. Д.С. Аляшкевіч; рэдкал.: І.П. Крэнь [і інш.]. – Слонім: Слонім. друк., 2002. – 392 с.

*Пастyпіў 06.05.2014*

## FROM THE HISTORY OF THE STUDY OF ARCHAEOLOGICAL MONUMENTS ON THE TERRITORY OF BASIN OF THE SHCHARA RIVER

***A. MAKSIMOVICH***

*The article is devoted to the history of the research of Medieval archaeological monuments on the territory of basin of the Shchara river. Four stages in studying of the region are distinguished: 1) the end of XIX – the beginning of XX cent.; 2) 1920–1940s; 3) 1950–1970s; 4) 1980s – the beginning of XXI cent. Within the confines of each stage the activities of the leading researchers are reviewed (F.V. Pokrovskiy, F.D. Gurevich, J.G. Zverugo, V.G. Suprun, A.V. Kvyatkovskaya, etc.). The evaluation of the research state is given (availability of the source base, hypotheses about ethnic structure of the population, economic and cultural development of the region), the discovered monuments are mapped (about 160, 9 of them were investigated by excavations), actual problems (check and specification of the existing hypotheses, research of the settlement system) and its possible solutions are defined (archaeological research with attraction of the methods of interdisciplinary sciences).*